**В. В. Новік,**
метадыст вышэшай катэгорыі
аддзела адукацыі Светлагорскага райвыканкама

## Моўная і літаратурная адукацыя Светлагоршчыны. З вопыту работы

### Метадычнае суправаджэнне прафесійнага развіцця сучаснага настаўніка-моваведа пры арганізацыі адукацыйнага працэсу

Шлях прафесійнага развіцця педагога – гэта паступовае,складанае і далёка не заўсёды лінейнае ўзыходжанне ад настаўніка-навічка да сапраўднага творцы,суб'екта прафесійнай дзейнасці, аўтара асабістай метадычнай сістэмы.

Ёсць пэўная заканамернасць у авалодванні настаўнікам рознымі бакамі сваёй прафесіі.

У пачатку прафесійнай дзейнасці ў настаўніка,як правіла, мацней выражана роля прадметніка, таму што ў перыяд станаўлення ідзе асваенне зместу навучання. Затым фарміруецца пазіцыя метадыста; у перыяд сталення настаўнік усё болей увагі пачынае ўдзяляць працэсу навучання, метадам яго ўдасканалення. Разам з майстэрствам з'яўляецца неабходнасць у асмысленні і аналізе сваёй дзейнасці, больш глыбокай педагагічнай ацэнцы вынікаў навучання вучняў.

Дадзеныя асаблівасці мы ўлічваем пры арганізацыі метадычнага суправаджэння прафесійнага развіцця сучаснага настаўніка-філолага.

Прафесіяналізм, безумоўна, не проста прыходзіць з вопытам, ён залежыць яшчэ ад многага другога: матывацыі настаўніка, зместу работы, цікавасці да справы, асабістых здольнасцей і асобасных якасцей.

Нельга лічыць, што толькі з дапамогай навучання з маладога настаўніка можна зрабіць суперпрафесіянала.

Аднак шматгадовы вопыт на пасадзе метадыста дазволіў упэўніцца ў тым, што мэтанакіраванае, правільна арганізаванае навучанне ў сістэме метадычнай работы адыгрывае ў станаўленні педагога-прафесіянала немалаважную ролю.

Аб гэтым падрабязней.

За доўгі час работы ў галіне адукацыі склаўся свой вопыт,свая сістэма работы. Лічу, што галоўнае, што дапамагае здзяйсняць метадычнае суправаджэнне дзейнасці настаўнікаў роднай мовы і літаратуры – гэта дадзеная магчымасць паралельна працаваць у школе, г. зн. адчуваць усе праблемы на сабе, прайсці ўсе новаўвядзенні разам са сваімі настаўнікамі.

Бясспрэчна, што больш прадметная работа па беларускай мове вядзецца з настаўнікамі на другой і трэцяй ступенях навучання.

Вывучэнне беларускай мовы ў 5-11кл. носіць прыкладны характар і адказ за ўсе гады навучання ў школе нясе настаўнік беларускай мовы!

Настаўнікі роднай мовы і літаратуры ўдасканальваюць методыку,выкарыстоўваючы вопыт расійскай школы, бо метадыст курыруе і работу з настаўнікамі рускай мовы і літаратуры. Вопыт работы з гэтай

катэгорыяй быў прадстаўлены на абласным(24.01.2009г) семінары па тэме " Роля РВМК у падрыхтоўцы настаўнікаў-філолагаў , вучняў да ЦТ"; на рэспубліканскім семінары(29-30.04.2009г.) па тэме "Арганізацыя метадычнай работы з настаўнікамі-моваведамі ў міжкурсавы перыяд".

Пры арганізацыі работы метадыста мы ўлічваем кадравы састаў, асаблівасці года, нарматыўныя дакументы,запыты педагогаў.

Агульная колькасць настаўнікаў беларускай мовы – 74;
З вышэйшай адукацыяй – 71(95,9%);
З сярэдняй спецыяльнай – 3(4,1%);
Маладых спецыялістаў – 3(4,1%);
Завочнікаў – (0);
З вышэйшай катэгорыяй – 20(27%)
З першай катэгорыяй – 40(54,1%)
З другой катэгорыяй – 8(10,8%)
Без катэгорыі – 6(8,1%)

Улічваючы гэтыя паказчыкі, а таксама рэкамендацыі МА РБ, ГАІРА, вызначаем мэты і задачы метадычнай работы.

**Мэта работы метадыста:** садзейнічаць асабістаму і прафесійнаму росту настаўнікаў сродкамі метадычнай работы і вучобы.

**Задачы:** садзейнічаць арганізацыі навучальнага працэсу ў адпаведнасці з асаблівасцямі года,нарматыўнымі дакументамі; садзейнічаць павышэнню якасці моўнай і літаратурнай адукацыі праз развіццё педагагічнай практыкі; здзяйсняць метадычнае суправаджэнне дзейнасці ўсіх метадычных фарміраванняў.

Настольнай кнігай для нас з'яўляецца кніга А.А.Глінскага "Упраўленне сістэмай метадычнай работы ва ўстанове адукацыі",па якой вызначаем накірункі сваёй дзейнасці.

Асноўнымі прынцыпамі планавання з'яўляюцца пераемнасць, сістэмнасць, дыферэнцыраванасць, прынцып творчасці, бесперапыннасці.

У раёне склаўся адзіны падыход да работы настаўнікаў-моваведаў: мы не адмаўляем традыцыйнае навучанне, якое з'яўляецца фундаментам адукацыі; але мы за сучасныя тэхналогіі як сродак удасканалення і асобы настаўніка, і асобы вучня.

Шмат настаўнікаў працуюць з выкарыстаннем элементаў сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы на 2-3 ступенях навучання. Вось толькі невялікі іх пералік: ІКТ,тэхналогія мнагамерных дыдактычных інструментаў, праектная тэхналогія, тэхналогія развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, тэхналогія апераджальнага навучання, узроўневай дыферэнцыяцыі, тэхналогія педмайстэрняў,тэхналогія "адкрыцця ведаў" і інш.На рэспубліканскім семінары(8-9.12.2010г.) быў

прадстаўлены вопыт Т.У. Хоміч (гімназія) па тэме "Выкарыстанне аўтарскіх мультымедыйных матэрыялаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры".

Пачынаючы з 2004года, калі дзяржаўны экзамен па беларускай мове ў форме ЦТ праводзіўся ў нашай рэспубліцы ўпершыню, была праведзена карэкціроўка зместу метадычнай работы з настаўнікамі-філолагамі:яшчэ ў большай ступені поспех на экзамене стаў залежаць ад намаганняў настаўнікаў,што працуюць на першай, другой і трэцяй ступенях навучання.Так была створана аўтарская мадэль метадычнай работы, якая складаецца з двух частак: 1 – маніторынг,аналітычныя зрэзы; 2 – карэкцыйная работа вучэбна-метадычнага кабінета.

Падрабязней спынюся на другой частцы.

Мы ўявілі мадэль у выглядзе канцэнтрычных акружнасцей (з агульным цэнтрам). Так як галоўным у дзейнасці настаўніка з'яўляецца вынік,якасць моўнай і літаратурнай адукацыі,якая вымяраецца экзаменам ,у цэнтр акружнасці мы яго і паставілі (экзамен у форме дыктанта, пераказа, ЦТ).

Бліжэй усяго да яго – вучань,потым настаўнік, адміністрацыя ўстановы адукацыі, бацькі,профільны метадыст.

Калі прачытаць схему ў накірунку да яе цэнтра, можна вызначыць характар метадычнай дзейнасці, звязанай з трайной накіраванасцю: да кіраўнікоў устаноў адукацыі, настаўнікаў, вучняў і бацькоў.

Адсюль вынікае задача метадыста – забяспечыць супрацоўніцтва, партнёрства, не дапусціць збою ў гэтай сістэме.

Размясціўшы вакол гэтай мадэлі асноўныя і прамежкавыя мерапрыемствы праграмы прафесійнага развіцця педагогаў, можна вызначыць і ролю метадыста ў рабоце па павышэнні педмайстэрства настаўнікаў,ад якога залежыць якасць адукацыі.

Такі падыход дапамагае рэалізацыі прынцыпа сістэмнасці. Выкарыстоўваючы яго, можна лёгка зрабіць аналіз сваёй дзейнасці.

Работа па гэтай сістэме прыносіць свой плён,вопыт гэтай работы прадстаўляўся на абласным і рэспубліканскім узроўнях.

Па гэтай удасканаленай сістэме мы працуем 7 гадоў. Пры гэтым улічваем кадравы састаў, асаблівасці года, нарматыўныя дакументы, запыты педагогаў.

**Мэта работы метадыста: садзейнічаць асабістаму і прафесійнаму росту настаўнікаў- моваведаў сродкамі метадычнай работы і вучобы**.

У практыцы работы метадыста семінары-практыкумы і спецсемінары, Дні педмайстэрства і Дні адчыненых дзвярэй,

навукова-практычныя канферэнцыі, метадычныя святы і фестывалі, Дні педмайстэрства, майстар-класы па найбольш важных накірунках..

Улічваючы той факт, што методыка рускай мовы больш удасканаленая, мы праводзім бінарныя семінары з сумесным абмеркаваннем пазіцый настаўнікаў беларускай і рускай моў; сумесныя заняткі са школамі-партнёрамі ў рамках міжшкольных метадычных аб'яднанняў; ШМА разам з настаўнікамі пачатковых класаў па праблемах пераемнасці ў навучанні.

Ёсць у нас і цікавы вопыт падрыхтоўкі кіраўнікоў школьных метадычных аб'яднанняў:некалькі гадоў працавала на базе ДУА "СШ№2" спецыяльная школа па тэме "Змест,планіраванне і арганізацыя метадычнай работы з настаўнікамі-філолагамі ва ўстановах адукацыі".

Наогул,мы практыкуем правядзенне адкрытых пасяджэнняў школьных метадычных аб'яднанняў,працуем над стварэннем відэатэкі для новых кіраўнікоў.

Прыярытэтным накірункам дзейнасці РВМК з'яўляецца работа з маладымі спецыялістамі. Вопыт па тэме "Пад апекай старэйшых калег праходзіць адаптацыя маладых педагогаў Светлагоршчыны" прадстаўлены ў СМІ ("НГ" 14 кастрычніка 2008г.) Формы работы з маладымі настаўнікамі розныя: інструктыўна-метадычныя нарады, школы маладога настаўніка, майстар-класы, Дні маладога настаўніка ў РВМК, Дні адчыненых дзвярэй, метадычныя святы і інш.

З мэтай прапаганды педагагічнага вопыту ў раёне праводзяцца тыдні педмайстэрства, на якіх можна наведаць бінарныя ўрокі настаўнікаў пачатковых класаў і беларускай мовы і літаратуры, факультатыўныя заняткі, пазакласныя мерапрыемствы, што сталі вынікам сумеснай работы дзяцей рознага ўзросту.

Накоплены вопыт работы з таленавітымі і адоранымі вучнямі,які прапагандуецца на штогодніх фестывалях,конкурсах,канферэнцыях.

Склалася практыка падрыхтоўкі да алімпіяд у рознаўзроставых групах,дзе старэйшыя вучні дапамагаюць малодшым(ДУА "Гімназія г. Светлагорска".)

Рэзультатыўна выступаюць нашы вучні 5-8 і 9-11класаў на абласной і рэспубліканскай алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры. Пераможцы алімпіяды(трэці і чацвёрты этапы) 2007\2008 год: пераможцаў у вобласці, 7 (5–8кл); 5 (9–11 кл). 2008/2009год: у вобласці ,4 (5–8 кл), 5 (9–11 кл); у рэспубліцы – 2 (9–11 кл). 2009/2010: увобласці 5 (5–8 кл), 7 (9–11 кл); у рэспубліцы 1 (9–11кл). 2010/2011год: у вобласці 8 (5–8кл.), 8 (9–11 кл); 1 – у рэспубліцы. Пераможцам абласнога адкрытага фестывалю газет і часопісаў УА, прысвечаных Дню беларускага пісьменства стала разам са сваімі вучнямі настаўніца сельскай школы І.Ф. Анацка (Каранёўская СШ). Пераможцамі двух абласных конкурсаў "Гавары са мной па-беларуску" сталі 5 нашых вучаніц з гімназіі і СШ№12. Настаўнікі-моваведы сталі арганізатарамі конкурсу па беларускай мове і літаратуры "БУСЛІК" сярод вучняў 3–11 класаў, дзякуючы якому метадычная палічка філолагаў штогод папаўняецца цікавай і патрэбнай спецыяльнай літаратурай.

Аналіз работы за 3 гады сведчыць аб узрастаючай магчымасці настаўніка атрымаць кваліфікаваную дапамогу на раённым узроўні.

Між тым мы арганізуем своечасовую курсавую перападрыхтоўку настаўнікаў на базе Гомельскага абласнога інстытута развіцця адукацыі,Акадэміі паслядыпломнай адукацыі г. Мінска; настаўнікі –моваведы наведваюць гаспадарча-разліковыя семінары, удзельнічаюць у абласных і рэспубліканскіх конкурсах;на базе раёна праходзяць абласныя семінары.

Асаблівасць метадычнай работы ў апошнія гады – яе скіраванасць на выкананне "Комплекса мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне арфаграфічнай аднастайнасці ў адпаведнасці з Законам РБ "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі".

На працягу 2008–2009 гадоў вялася тлумачальная і падрыхтоўчая работа па азнаямленні з новым Законам.

У складанай сітуацыі працавалі педагогі ў 2010-2011годзе: выкарыстоўваючы існуючыя вучэбна-метадычныя дапаможнікі, якія выйшлі да 2010 года, настаўнікі ажыццяўлялі адбор матэрыялу, яго пераасэнсаванне ў адпаведнасці з прынятымі дакументамі.У такой сітуацыі ўзмацнілася роля самаадукацыйнай работы і роля РВМК.

Пад назвай " Вывучаем беларускі правапіс" прайшлі ў 2010-2011 годзе ўсе мерапрыемствы метадычнага характару.

Сярод іх і семінар-практыкум, што прайшоў на базе СШ№4; конкурс для ШМА на лепшы вучэбны стэнд па пытаннях змен у правілах, на лепшую арфаграфічную хвілінку (Вопыт прадстаўлены ў часопісе"Беларуская мова і літаратура" №6, 2011 г.).

Сама задума ўзнікла на аснове рэкамендацый МА РБ: "На кожным уроку беларускай мовы неабходна праводзіць арфаграфічныя хвіліны, на якіх трэба знаёміць вучняў са зменамі ў напісанні тых ці іншых слоў у адпаведнасці з новай рэдакцыяй правіл".

Мэтай правядзення конкурсу стала ўдасканаленне слоўнікавай работы, знаёмства з лепшым вопытам работы, актывізацыя дзейнасці ШМА.

Усе матэрыялы, значныя па сваёй сутнасці, сабраны Ў РВМК і выкарыстоўваюцца ўсімі зацікаўленымі спецыялістамі адукацыі.

Творчая група настаўнікаў ДУА "СШ№3, сярод якой настаўнік вышэйшай катэгорыі, магістр у галіне філалогіі Каліцкая І.У., распрацавала праект "Беларуская мова: новыя правілы арфаграфіі ў тэстах"

Арганізавана інфармацыйна-бібліяграфічная падтрымка педагогаў па рэалізацыі палажэнняў Закона праз сайты (СШ№4,10). Падрыхтаваны прэзентацыі па новаму правапісу (СШ№8,12,№10). Памяткі-коміксы для малодшых рыхтуюць вучні старэйшых класаў (СШ№12, настаўнік Сікорская Ю.У.)

Ёсць у нас і вопыт распрацоўкі гэтай тэмы сумесна настаўнікам і вучаніцамі 11кл. СШ№4. Тэма работы"Прыёмы візуалізацыі пры вывучэнні змен у беларускім правапісе" (Лявоненка С.У.)

За тры месяцы гэтага навучальнага года настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры распрацавана нагляднасць да арфаграфічных хвілінак: газеты-коміксы,газеты-канспекты; афармляецца альманах "Вывучаем беларускі правапіс" з планаў-канспектаў па новаму правапісу; падрыхтаваны макет часопіса "Веснік адукацыі Светлагоршчыны" з артыкуламі настаўнікаў вышэйшай катэгорыі па праблемах увядзення новага правапісу. Плануем падрыхтаваць зборнік нагляднасці для настаўнікаў.

Аналіз паказвае,што з педагогамі праводзіцца на раённым узроўні да 20 мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць росту педмайстэрства настаўніка.

Акрамя таго, РВМК прапануе настаўнікам свой метадычны прадукт :

- практычны дапаможнік”Сістэма работы настаўніка па падрыхтоўцы вучняў да экзамена ў форме ЦТ”;

- альманах”Урок сёння і заўтра”;

- карты карэкцыі моўнай граматнасці;

- пакет дакументаў “У дапамогу маладому настаўніку”;

-узоры курсавых, даследчых,навуковых работ;

- фотаальбом “Робім кабінет сваімі рукамі” і інш.

Мы займаемся і выдавецкай дзейнасцю. Настаўнікі –моваведы друкуюцца ў часопісе”Беларуская мова і літаратура”.

Практыкуем падрыхтоўку метадычных рэкамендацый для настаўнікаў і намеснікаў дырэктараў.

Не забываем аб важнасці развіцця педагога як творчай асобы. Арганізуем сустрэчы з паэтамі-землякамі С.М.Шах, І.Р.Катляровым;В. Ткачовым,Л. Дранько-Майсюком,Б.Пятровічам,Э.Акуліным.

Праз спланаваную метадычную работу вырашаны многія праблемы.Галоўнае тое, што педагогі Светлагоршчыны ўсведамляюць значнасць абнаўлення форм і метадаў навучання і выхавання.

Нельга сцвярджаць,што ўсе настаўнікі поўнасцю перайшлі на выкладанне па-новаму,па-сучаснаму. Многія знаходзяцца на стадыі асэнсавання.

Па-ранейшаму застаецца важнай праблема узбагачэння ўласнага вопыту ведамі інавацыйных методык навучання і выхавання. Для настаўнікаў беларускай мовы гэта задача ўскладняецца тым, што вельмі мала літаратуры прыкладнога характару: таму ў лепшым выпадку настаўнік вучыць настаўніка. Добрым дарадцам філолагаў з’яўляюцца прадметныя і педагагічныя часопісы.

Спадзяёмся на дапамогу ГАІРА,АПА ў вырашэнні нашых прблем,бо галоўнае ў рабоце настаўніка не толькі вучыць дзяцей, але і вучыцца самому,каб быць сучасным настаўнікам.У гэтым асноўная стратэгія прафесійнага развіцця педагогаў Светлагорскага раёна.